3. 1941–1945 гады – этап дзейнасці БДУ ў эвакуацыі, вяртанне БДУ у Мінск у 1944 г.;

4. 1945–1953 гады – этап пасляваеннага аднаўлення Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэту;

5. 1953–1991 гады – этап развіцця БДУ, для якога характэрна развіццё і пашырэнне ўнутранай структуры, яе пашырэнне ў колькасным плане.

6. 1991 г. і па нашыя дні. На гэтым этапе Ўніверсітэт з’яўляецца флагманам беларускай сістэмы вышэйшай адукацыі, нацыянальным навуковым цэнтрам, які адыгрывае значную ролю ў дзяржаўным будаўніцтве Рэспублікі Беларусь.

### Бібліяграфічны спіс


1. *Баранова, Е. В.* В. И. Пичета и власть в 1920 гг. // Российско-славянские исследования: науч. сб. 2009. Вып. 4. С. 178–186.

2. Белорусский ордена Трудового Красного Знамени государственный университет им. В. И. Ленина / Редкол.: А. Н. Севченко [и др.]. Минск: Изд-во БГУ, 1971. 319 с.

3. *Кіпель, Я.* Эпізоды / Пад рэд. І. Урбановіч, З. Саўкі. Нью-Йорк, 1998. 305 с.

4. *Пічэта, У. І.* Пытанне аб вышэйшай школе на Беларусі ў мінулым. Мінск: Навука і тэхніка, 1991. 48 с.

5. *Яноўскі, А. А.* У пошуках аптымальных методык выкладання (з гісторыі арганізацыі вучэбнага працэсу ў БДУ ў 1920–1930-я гады) // Гісторыя: праблемы выкладання. 2006. № 6. С. 3–10.



**Літвіноўская Юлія Іваноўна**
*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт інфарматыкі і радыёэлектронікі*
*(Мінск, Беларусь)*


## СТАН БЕЛАРУСКАЙ АСВЕТЫ НА ПАЧАТКУ XIX ст.

На канец XVIII – першую палову XIX ст. прыпадае пачатковы этап новых, пасля раздзелаў Рэчы Паспалітай, узаемаадносін паміж культурамі Беларусі і Расіі. На пярэднім плане гэтых даволі складаных і неадназначных узаемаадносін апынуліся такія ўжо сфарміраваныя культурныя плыні, як шляхецкая культура Беларусі і руская дваранская імперская культура. Шмат у чым гэтыя культуры былі роўнавялікія, найперш на ўзроўню развіцця. Да XIX ст. яны прыйшлі значна адноўленымі бурнымі працэсамі еўрапеізацыі, узбагачаныя ідэямі і ідэаламі эпохі Асветніцтва, аднак мелі розныкультурны вопыт, арыентацыі і традыцыі. І гэта, апошняя, пазначалася на развіцці ўсіх сфер культурнага жыцця краю, асабліва народнай асветы.

Сеймам 1773–1775 гг. у Рэчы Паспалітай была заснавана Адукацыйная камісія – установа па кіраўніцтву народнай асветай. Гэта была першая падобнага рода установа ў Еўропе. Камісія ажыццявіла рэформу школ і ўніверсітэтаў у духу ідэй Асветніцтва. Правядзенню рэформы спрыяў роспуск ордэна езуітаў у 1773 г., школы і маёмасць якога былі перададзены Адукацыйнай камісіі. Вышэйшую ступень новай сістэмы адукацыі стварылі Ягелонскі ўніверсітэт у Кракаве і Галоўная школа ВКЛ у Вільне.

Сярэднюю ступень адукацыі складалі акруговыя і падакруговыя школы. Ніжэйшай павінны былі стаць парафіяльныя вучылішчы, адкрыццё якіх прадугледжвалася ў мястэчках і гарадах. Агульнае кіраўніцтва справай асветы забіралася з рук духавенства. Школа набывала свецкую накіраванасць [1, с. 62–63].

Рэгіёны Беларусі ўваходзілі да складу Расійскай імперыі паступова па меры падзела Рэчы Паспалітай і канчаткова ў 1795 г. У выніку ў канцы XVIII ст. на Беларусі дзейнічалі розныя тыпы школ: у цэнтры і на захадзе – школы былой Адукацыйнай камісіі Рэчы Паспалітай, на ўсходзе – галоўныя і малыя народныя вучылішчы, заснаваныя паводле расійскага статута 1786 г. Гэта былі свецкія школы. Акрамя іх існавалі манастырскія, уніяцкія і каталіцкія навучальныя ўстановы, у тым ліку езуіцкія.

Да пачатку XIX ст. на Беларусі склалася даволі заблытаная сетка навучальных устаноў, пазбаўленых адзінага кіраўніцтва і не звязаных паміж сабой. Дыяпазон разнастайных навучальных сістэм дазваляў пры жаданні і магчымасцях атрымаць адукацыю, адпаведную ўзроўню ведаў XVI, XVII ці XVIII ст. на польскай, рускай, яўрэйскай, французскай і нямецкай мовах. Напярэдадні школьнай рэформы 1803–1804 гг. на Беларусі існавала каля 130 пачатковых, 33 сярэдніх і няпоўныя сярэднія школы, значная колькасць яўрэйскіх рэлігійных школ, каля 40 школ розных каталіцкіх ордэнаў. Агульная колькасць навучэнцаў у канцы XVIII ст. ва ўсіх школах (за выключэннем яўрэйскіх) не перавышала 4 тыс. чалавек. Школьная адукацыя была даступна дзецям шляхты, духавенства, заможных гараджан [1, с. 206].

Народныя школы былі створаны ў Расіі па ўзору прускіх і аўстрыйскіх школ і працавалі пад кіраўніцтвам зацверджанай у 1782 г. імператрыцай Кацярынаю II Камісіі па ўсталяванню народных школ. Яны ствараліся на абшарах усей імперыі. У губернскіх цэнтрах – галоўныя чатырохкласныя, у павятовых – малыя двухкласныя. На Беларусі галоўныя былі адкрыты ў Магілёве і Віцебску, малыя – Полацку, Оршы, Чавусах, Мсціславе, Копылі, Чэрыкаве і інш. Народныя школы адчынілі дзверы для прадстаўнікоў усіх саслоўяў, практыкавалі сумеснае навучанне хлопчыкаў і дзяўчынак. На ўсходзе Беларусі яны ствараліся як альтэрнатыва мясцовым традыцыйным прыкляштарным калегіўмам. Навучэнне ў іх было бясплатным. Рускія настаўнікі гэтых школ у большасці былі добра падрыхтаваныя прафесійна і вызначаліся шчырай прыхільнасцю справе пашырэння асветы [2, с. 138].

Народныя вучылішчы былі даступнымі для ўсіх слаёў гарадскога насельніцтва. У іх у гэты час вучылася звыш 400 дзяцей дваран мяшчан, сялян

жыўшых у гарадах, а іх было 10,9%. Дзяўчынкі складалі 11% ад усіх навучэнцаў [3, с. 170].

У пачатку XIX ст. у Расіі была праведзена рэформа ў галіне адукацыі. У 1802 г. упершыню ў яе гісторыі ствараецца Міністэрства народнай асветы. Еўрапейская частка краіны была падзелена на 6 навучальных акруг. На чале кожнай з іх знаходзіліся назначаныя царом папячыцелі. Віцебская, Гродзенская, Магілеўская і Мінская губерні ўвайші ў склад Віленскай вучэбнай акругі, папячыцелем якой быў адзін з "маладых сяброў" Аляксандра I буйны польскі магнат Адам Чартарыйскі. У акругах цэнтам вучэбнага і адміністрацыйнага кіраўніцтва асветай быў універсітэт. Для Беларусі, Літвы і Правабярэжнай Украіны, якія знаходзіліся ў адной акрузе, такім цэнтрам быў Віленскі ўніверсітэт. Ён быў створаны ў 1803 г. на базе Галоўнай Віленскай школы (заснавана ў 1570 г. езуітамі як калегіўм).

У 1804 г. быў прыняты "Статут навучальных устаноў, падначаленных універсітэтам". Утваралася новая сістэма адукацыі: універсітэт – гімназія – павятовыя вучылішчы – прыходскія вучылішчы. [4, с. 507–508]. Агульным для ўсіх ступеняў адукацыі было тое, што ў іх, да рэскрыпту Мікалая I 1827 г., прымаліся вучні ўсіх саслоўяў. Такім чынам, прынамсі тэарэтычна, магчымасць атрымаць добрую адукацыю мелі ўсе саслоўі [3, с. 171].

Гімназіі, павятовыя і прыходскія вучылішчы на беларускіх землях ствараліся, як правіла, на базе наяўных школ. Аднак у першай трэці XIX ст. было заснавана і нямала новых, галоўным чынам першапачатковых вучылішч, у тым ліку ланкастэрскіх – бясплатных школ для бедных, дзе навучанне вялося на сістэме англійскага педагога Дж. Ланкастэра. Яна аснована была на прынцыпах узаемнага навучання, якія прадугледжвалі навучанне дзяцей і дарослых больш падрыхтаванымі вучнямі пад кіраўніцтвам настаўніка. У 20–30-я гг. XIX ст. у Беларусі працавала больш за 20 ланкастэрскіх школ [2, с. 141]. Усталяваная ў Беларусі трохступенная сістэма адукацыі прадугледжвала 7-гадовы тэрмін начання ў гімназіі; 4-гадовы у павятовых вучылішчах, 2-гадовы – у прыходскіх.

Асноўнай мовай, на якой вялося выкладанне заставалася польская. Руская мова ў вучэбны план вучылішчаў уводзілася толькі ў тым выпадку, калі былі жадаючыя яе вывучаць [3, с. 508–509]. У цэлым сістэма навучання і выхавання была пранізана польскім патрыятычным духам. Царскія ўлады пагаджаліся з гэтым дзеля паразумення з польскімі памешчыкамі. Існаванне беларускага этнаса і мовы не прызнавалася ні тымі, ні другімі. Беларуская мова не вывучалася і навучанне на ёй не дапускалася нават у пачатковай школе.

Што датычыцца навучальных праграм, то гімназіі спачатку мелі рэальны накірунак. Выкладаліся фізіка, матэматыка, пачатковыя асновы тэхналогіі і камерцыйных навук, філасофія, гісторыя, геаграфія, статыстыка, польская, руская, лацінская, французская і нямецкая мовы. Пасля 1828 г. – Закон Божы, царкоўная гісторыя, логіка, геаметрыя і інш.

Асноўнае месца ў вучэбных планах 4-гадовых вучылішчаў было адведзена вывучэнню мовы і літаратуры (польскай, лацінскай, французскай і нямецкай).

Прыблізна 1/4 усяго часу адводзілася на вывучэнне фізіка-матэматычных навук. У вучылішчах выкладалі таксама гісторыю, геаграфію, логіку і права. Неабходна адмеціць таксама адну вельмі істотную акалічнасць – пераемнасць вучэбных планаў гімназій, павятовых і прыходскіх вучылішчаў.

З цягам часу стаў усе больш выразна праяўляцца саслоўны характар новай рэформы асветы. Ён яскрава адчуваўся ў выдадзеным у 1807 г. "Статуце для прыходскіх вучылішчаў". Статут прадугледжваў стварэнне некалькі тыпаў прыходскіх школ. Для дзяцей дваранства і рамеснікаў трэба было заснаваць мужчынскія і жаночыя 2-класныя вучылішчы. Але, калі ў школе вучыліся дзеці "бедных рамеснікаў", тэрмін навучання для іх скарачалі на 6 месяцаў, таму што яны, як адзначалася ў статуце, абавязаны "падзяліць працу бацькоў". Праграма прыходскіх вучылішчаў для дзяцей дваран і рамеснікаў побач з агульнаадукацыйнымі прадметамі прадугледжвала азнаямленне іх з некаторымі відамі рамёстваў. Шмат увагі падавалася рэлігійна-маральнаму выхаванню.

Для сялянскіх дзяцей было рэкамендавана адкрыць толькі аднакласныя вучылішчы. Агульнаадукацыйная падрыхтоўка ў іх не прадугледжвалася. Дзяцей сялян трэба было навучаць "перасаджванню і прышчэпліванню дрэў, рабіць добрыя земляробчыя прылады … і хатняй гаспадарцы, а таксама застаўляць іх "завучваць на памяць духоўныя песні пра хатніх дабрачынцаў і адчуваць агіду ды заганы". Чытанне, пісьмо, лічэнне – гэта навукі, якія на думку складальнікаў статуту "не ўласцівы для сялянскіх дзяцей". Статут не рэкамендаваў адцягваць дзяцей прыгонных школьнымі заняткамі ад работы на памешчыка [4, с. 511].

Вучэбным і адміністрацыйным цэнтрам адукацыі быў Віленскі ўніверсітэт. Віленскай навучальнай акрузе было дазволена кіравацца не агульнарасійскім статутам навучальных устаноў, а асобным, які ўлічваў багаты вопыт дзейнасці Адукацыйнай камісіі Рэчы Паспалітай. Гэтым прызнаваліся заслугі камісіі ў галіне стварэння сістэмы асветы, падпарадкаванай дзяржаўным інтарэсам.

Рускія ўлады дазволілі захаваць польскую мову як асноўную мову навучання ў акрузе, разумеючы, што фарсіраванне ў пытаннях культурнай інкарпарацыі можа выклікаць моцнае супрацьдзеянне шляхты, што было небяспечным для імперыі. З другога боку, Віленскі ўніверсітэт быў адным з самых аўтарытэтных культурных і навуковых цэнтраў на землях былой Рэчы Паспалітай. Само яго існаванне азначала для мясцовай шляхты захаванне пэўнай культурнай камфортнасці. Да таго ж універсітэт вызначаўся высокім узроўнем навучання і даваў вышэйшую адукацыю еўрапейскага тыпу. Колькасць яго навучэнцаў была больш за самы старэйшы расійскі ўніверсітэт – Маскоўскі: 300 супраць 160 ў 1808 г. і 1300 супраць 800 у 1830 г. [2, с. 142].

Віленскі ўніверсітэт меў чатыры факультэты: маральна-палітычных навук, літаратуры і вольных мастацтваў, фізіка-матэматычны і медычны. На кафедрах універсітэту працавалі вядомыя вучоныя-энцыклапедысты свайго часу: браты Ян і Андрэй Снядэцкія, І. Франк і Г. Балнус, І. Лялеваль,

І. Анацэвіч, Н. Даніловіч, М. Баброўскі. Пры ўніверсітэце працавалі медычная, ветэрынарная і агранамічная школы, самы багаты ў Еўропе батанічны сад, абсерваторыя, заалагічны музей, тры клінікі, найбагацейшая бібліятэка, аптэка, друкарня, якая выпускала штомесячны навукова-літаратурны часопіс “DziennikWileński” [2, с. 142].

У адпаведнасці са “Статутам, або агульнымі пастановамі Віленскага ўніверсітэта і вучылішчаў яго акругі” ўніверсітэту былі падначалены ўсе навучальныя ўстановы на тэрыторыі Беларусі. Ён ажыццяўляў рэарганізацыю сістэмы школьнай адукацыі, камплектаваў выкладчыцкія кадры вучылішчаў, забяспечваў іх вучэбнымі дапаможнікамі і літаратурай клапаціўся аб матэрыяльным забеспячэнні школ і настаўнікаў.

З Віленскага ўніверсітэта ў школы Беларусі прыйшлі многія настаўнікі , якія адыгралі прыкметную ролю ў асвеце, актыўна удзельнічалі ў дэмакратычным грамадска-палітычным руху, склалі першы атрад беларускай разначынна-дэмакратычнай інтэлігенцыі. Погляды передавой прафесуры ўніверсітэта станавіліся здабыткам іх вучняў, з якімі пранікалі і ў беларускія школы. Нягледзячы на тое што выкладанне ваўніверсітэце вялося на польскай мове, сярод студэнцтва выкрышталізоўваліся ідэі беларускай нацыянальнай самасвядомасці.

Правядзенне адукацыйнай рэформы на Беларускі тармазілася недахопам сродкаў і падрыхтаваных настаўнікаў. Штогодны бюджэт для фінансавання школ быў вельмі бедным – ля 32 тыс. рублеў. Гэтай колькасці ледзь хапала на фінансаванне 6 гімназій або 11 павятовых вучылішч. Аплата працы настаўніка была вельмі мізэрнай. У выніку настаўнікі, пазбаўленыя магчымасці працягваць заняткі ў школах не атрымліваючы ніадкуль фінансавай дапамогі патрабавалі звальнення ад настаўніцкай пасады, а часам пакідалі родныя мясціны ў пошуках больш выгаднай службы. На Беларусі толькі для рэарганізацыі манастырскіх вучылішчаў патрабавалася ў 1804 г. не менш 212 настаўнікаў, а фактычна іх было толькі 136. Захады, прынятыя Віленскім універсітэтам – заснаванне настаўніцкай семінарыі хуткіх вынікаў не абяцаў: набор быў абмежаваны, доступ у семінарыю быў адкрыты галоўным чынам для дваран, якіх зусім не вабіла ўбогае існаванне настаўніка [2, с. 510–511].

## Бібліяграфічны спіс


1. Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. Мінск: Беларус. энцыкл., 1993. Т. 1.

2. Гісторыі Беларусі: У 6 т. Мінск: Экаперспектива, 2005. Т. 4. Беларусь у складзе Расійскай імперыі (канец XVIII – пачатак XX ст.). Мінск. 519 с.

3. *Парашкоў, С. А.* Гісторыя культуры Беларусі. Мінск, Бел. навука, 2003. 444 с.

4. Гісторыя Беларускай ССР: У 5 т. Мінск: Навука і тэхніка, 1972. Т. 1. 632 с.